# НАМ ДАПАМОЖА ЛЮБОЎ

Напэўна, гэта сустрэча і павінна была адбыцца менавіта ў такім цудоўным месцы, якім стала для многіх аматараў мастацтва карцінная галерэя Кастуся Качана ў Навагрудку. Наведаўшы яе аднойчы, падсвядома імкнешся зноў туды, дзе таленавіты мастак, уклаўшы ў сваё стварэнне шмат працы і часцінку сэрца, апантана імкнецца ўзняць культуру правінцыяльнага горада да сталічнага ўзроўню.



Сустрэчы з цікавымі людзьмі – неад’емная частка жыцця карціннай галерэі Кастуся Качана. 27 чэрвеня сюды завітала таленавітая Юлія Міцько. Канцэрт аўтарскай песні з узнёслай назвай “Нам дапаможа Любоў” сабраў у гэты вечар шмат прыхільнікаў паэзіі і бардаўскай песні. Чароўная Юлія Міцько шчодра дарыла сваім слухачам непаўторны дар сваёй душы – вершы і песні, кожная з іх – шчырая споведзь жаночага сэрца, чулага, пяшчотнага, трапяткога. Гэта была размова аб паўсядзённым і вечным, аб каштоўнасцях чалавечага жыцця, аб любові і шчасці. Адчувалася, што кожнае слова песні прайшло праз душу паэта, і гэта знаходзіла водгук у сэрцах слухачоў – абыякавых у зале не было, разам з бардам людзі ўсміхаліся і смуткавалі, радаваліся і спачувалі. Боскі дар паэта – быць простай і зразумелай і ў той жа час імкнуцца ўзняць за сабой да вышыні Неба – прываблівае і захапляе. У гэты вечар натхнёная выканаўца паяднала прысутных высокім пачуццём, галоўным для кожнага чалавека, пачуццём, здольным выратаваць у самай цяжкай сітуацыі, пачуццём усеабдымнай Любові. Такі моцны зарад высокіх пачуццяў здольны прыўнесці ў свет больш дабра, разумення і спагады.

Хочацца пажадаць Юліі поспехаў і спадарожнага ветру лёгкім ветразям яе творчага натхнення.

**Святлана КОШУР**

***На здымках:*** падчас сустрэчы з бардам Юліяй Міцько. Карцінная галерэя Кастуся Качана ў Навагрудку. 27 чэрвеня 2018 года.










КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ